# Юныя мастакі ствараюць кніжныя знакі

1 чэрвеня ў Дзень абароны дзяцей адбылося ўзнагароджанне ўдзельнікаў конкурсу "Малады беларускі экслібрыс" і адкрыццё выставы, у якой удзельнічалі юныя навучэнцы Дзіцячай мастацкай школы № 3 з Менска і іншых мастацкіх студый і вучэльняў краіны. У конкурсе, прымеркаваным да 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і 15-годдзя Музея кнігі, узялі ўдзел дзеці ад 6 да 16 гадоў. Для ўдзелу было даслана 170 прац з розных рэгіёнаў краіны.



Акрамя пастаяннай працы са студэнтамі, аспірантамі і даследчыкамі, Нацыянальная бібліятэка на працягу ўжо некалькіх гадоў працуе з дашкольнікамі і вучнямі малодшых класаў у межах музейнай педагогікі, каб прывіць цікавасць да чытання і пазнаёміць іх з кніжнай культурай.

Цягам апошніх месяцаў тут ладзілі мерапрыемствы, звязаныя з беларускай графікай: праводзілі выставу кніжных ілюстрацый, майстар-класы, заняткі ў Клубе кніжных прафесараў і іншыя імпрэзы. На гэты раз супрацоўнікі бібліятэкі захвацілі дзяцей зрабіць невялічкую творчую экспазіцыю.





Юныя мастакі прадумвалі сюжэты, ідэі і малявалі кніжныя знакі, перадаючы конкурсную тэму лаканічнымі сродкамі ў малым фармаце. Работы атрымаліся розныя: сур'ёзныя і вясёлыя, чорна-белыя і маляўнічыя, усе яны неардынарныя і індывідуальныя. Пераможцы конкурса былі ўзнагароджаны каштоўнымі прызамі, які прадаставіла партнёр конкурсу, кампанія OZ.

Ва ўзнагароджванні юных мастакоў узяў удзел вядомы менскі бібліяфіл і калекцыянер Алег Судлянкоў, які адначыў:

- Кніжны знак - экслібрыс - з'явіўся яшчэ ў Старажытным Егіпце, са з'яўленнем пісьменства. У часы фараона Аменхатэпа-IV ужо быў свой экслібрыс. У Еўропе на працягу апошніх шасці стагоддзяў былі створаны разнастайныя каштоўныя экслібрысы. Беларускія майстры экслібрысаў, такія, як Раман Сустаў і Леў Алімаў, з'яўляюцца вельмі паспяховымі. Выдатна, што дзеці стварылі новыя экслібрысы Нацыянальнай бібліятэкі.

Узнагародамі былі адзначаны ў малодшай узроставай катэгорыі Соф'я Платоненкава (11 г.), Соф'я Грыневіч (11 г.), Паліна Гарэлава (10 г.) .

У старэйшай катэгорыі былі ўзнагароджаны Вікторыя Фядковіч з Целяханаў (16 г.), Варвара Хмыльніна з Менска (13 г.) і Дар'я Бунас з Берасця (13 г.).

Педагог Юлія Уладзіміраўна Шаціла з Дзіцячай мастацкай школы № 3 падзякавала сваім выхаванцам за ўдзел у конкурсе і выставе.

*Э. Дзвінская,*
*фота аўтара.*